навіны

# БЕРАСЦЕЙСКІЯ КНІГАЗБОРЫ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

*1–2 чэрвеня 2012 г. па ініцыятыве Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага і пры падтрымцы Брэсцкага аблвыканкама адбылася II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання». Трэба адзначыць пашыраны склад удзельнікаў канферэнцыі ў параўнанні з 2008 г.: ад краязнаўцаў і музейных супрацоўнікаў Берасцейшчыны – да вядучых кнігазнаўцаў Беларусі, Польшчы, Казахстана, Расіі і Украіны, а таксама прысутнасць на ёй вядучых сучасных навукоўцаў і кнігазнаўцаў, прадстаўнікоў улады: дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскага, старшыні нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА У.Р. Шчаснага і намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама Л.А. Цупрыка. Як трапна заўважыў у прывітальным слове да ўдзельнікаў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскі: «Такі склад удзельнікаў і такая праграма сведчаць аб бліскучасці самой ідэі».*

*Падчас канферэнцыі працавалі чатыры секцыі, было заслухана 46 дакладаў.*

*Па выніках канферэнцыі плануецца выданне зборніка, навуковым рэдактарам якога, як і папярэдняга, будзе доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі М.В. Нікалаеў.*

*Аб інтарэсе да канферэнцыі з боку прафесіяналаў і грамадскасці сведчыць колькасць наведванняў на сайце Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага* http://www.brl.by: *на 01.11.2012 г. іх зафіксавана 21425.*

**А.М. МЯСНЯНКІНА**,
*нам. дырэктара па навуковай рабоце*
*УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага», г. Брэст*